## Заданні для правядзення ўступных іспытаў па гісторыі Беларусі

Выберыце правільныя адказы. Звярніце ўвагу, што ў пытаннях можа быць некалькі правільных адказаў.

**1. Сумеснае валоданне прыладамі працы, прадуктамі харчавання і жыллём з'яўляецца прыкметай:**

а) родавай абшчыны; б) кагалу; в) брацтва; г) вёскі.

**2. Збор князем даніны з насельніцтва падуладных яму зямель называўся:**

а) гвалт; б) талака; в) палюддзе; г) рэйтаршчына.

**3. У летапісе пад 980г. упершыню паведамляецца пра полацкага князя:**

а) Рагвалода; б) Ізяслава; в) Яраслава; г) Усяслава Чарадзея

**4. Самая старажытная сярод рукапісных кніг, знойдзеная на тэрыторыі Беларусі:**

а) "Аповесці мінулых гадоў"; б) "Тураўскае евангелле";

в) "Руская праўда"; г) "Слова пра паход Ігаравы".

**5. Каранацыя Міндоўга ў Навагрудку і прыняцце ім тытула караля сведчыла аб:**

а) канчатковай перамозе над крыжакамі;

б) пачатку ўтварэння новай дзяржавы - ВКЛ;

в) фарміраванні абсалютнай манархіі;

г) завяршэнні фарміравання тэрыторыі ВКЛ.

**6. Адной з прычын стварэння Рэчы Паспалітай з'яўлялася (-іся)**

а) распаўсюджванне Рэфармацыі на тэрыторыі ВКЛ;

б) цяжкае становішча ВКЛ у час Лівонскай вайны;

в) тэрытарыяльныя супярэчнасці з Турцыяй;

г) барацьба польскіх каралёў за шведскі трон.

**7. У грамадстве ВКЛ у 16-18ст. "бабылямі", "кутнікамі", "халупнікамі" называлі:**

а) дробных гандляроў; б) вясковую адміністрацыю;

в) беззямельных сялян; г) членаў цэхаў.

**8. Яўрэям на беларускіх землях пасля далучэння да Расійскай імперыі было дазволена:**

а) сяліцца ў гарадах і мястэчках; б) набываць маёнткі з сялянамі;

в) ствараць палітычныя аб'яднанні; г) выбірацца ў органы ўлады.

**9. Удзельнікі "Дэмакратычнага таварыства" (1836-1838гг.) выступалі за:**

а) права кожнага народа на нацыянальную самасвядомасць;

б) усталяванне дыктатуры пралетарыяту;

в) вяртанне "залатых шляхецкіх вольнасцей";

г) пераход да супрацоўніцтва з царскім урадам.

**10. Падрабязнае апісанне дзяржаўных маёмасцей у час правядзення рэформы П.Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы атрымала назву:**
а) нацыяналізацыя; б) рэквізіцыя;
в) люстрацыя; г) сертыфікацыя.

**11. Знакамітая беларуская паэтэса пачатку 20ст., адна з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады:**
а) К.Буйніцкая; б) А.Пашкевіч (Цётка); в) А.Ажэшка; г) Ф.У.Радзівіл.

**12. Правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы ў Беларусі ў пачатку 20ст. спрыяла:**
а) стварэнню праслойкі заможнага сялянства;
б) ліквідацыі памешчыцкага землеўладання;
в) фарміраванню нацыянальнай інтэлігенцыі;
г) канцэнтрацыі прамысловай вытворчасці.

**13. Прадстаўнікі палітычнай групоўкі "чырвоных" у нацыянальным руху на землях былой Рэчы Паспалітай выступалі за:**
а) захаванне цэласнасці Расійскай імперыі;
б) устанаўленне дыктатуры пралетарыяту;
в) выкарыстанне ўзброенай барацьбы;
г) атрыманне аўтаноміі ў складзе Расіі.

**14. Згодна з Маніфестам 17 кастрычніка 1905г.:**
а) стваралася заканадаўчая Дзяржаўная дума;
б) абвяшчалася непарушнасць абсалютнай манархіі;
в) абвяшчалася права нацыі на самавызначэнне;
г) адмянялася прыгоннае права.

**15. Вынікам Лютаўскай рэвалюцыі 1917г. з'яўлялася (-ўся):**
а) абвяшчэнне Расіі дэмакратычнай рэспублікай;
б) усталяванне ваеннай дыктатуры Л. Карнілава;
в) усталяванне ў Расіі абсалютнай манархіі;
г) пераход улады ў рукі бальшавікоў.

**16. Прачытайце вытрымку з дакумента і запішыце прычыну, якая тармазіла развіццё сельскай гаспадаркі ў першай палове 19ст.**
"Асноўная прычына нездавольняючага стану сельскай гаспадаркі заключаецца ў…праве, пры якім сяляне…не маючы ніякіх правоў уласнасці на зямлю, якую яны апрацоўваюць, неахвотна працавалі на палях, што заўсёды маглі быць адабраныя ў іх…З другога боку, яно (права) перашкаджала развіццю і ўдасканальванню земляробства ў памешчыцкіх гаспадарках".

**17. Пазнайце гістарычную асобу і запішыце імя.**
Адзін з вялікіх князёў ВКЛ. Здзейсніў тры паходы на Маскву. «Ён не піў ні віна, ні піва, меў вялікі розум і падпарадкаваў многія землі. Скрытна рыхтаваў свае паходы, ваяваў не столькі колькасцю, колькі ўменнем». Тэрыторыя ВКЛ у час праўлення гэтага князя павялічылася ўдвая.

**18. Суаднясіце элементы двух мностваў, якія адносяцца да перыяду станаўлення ВКЛ:**

| | |
|---|---|
| А) Далучэнне Бранскай зямлі да ВКЛ | 1) князь Вітаўт |
| Б) Канчатковае далучэнне Смаленскага княства да ВКЛ | 2) князь Віцень |

В) Пачатак аб'яднання літоўскіх зямель вакол Навагрудскага княства — 3) князь Альгерд

Г) Уваходжанне Полацкай зямлі ў склад ВКЛ — 4) князь Міндоўг

**19. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў 16-18ст. у ВКЛ:**

| | |
|---|---|
| А) стварэнне Галоўнага трыбунала ВКЛ | 1) ВГБА |
| Б) падпісанне Люблінскай уніі | 2) ВБАГ |
| В) увядзенне “Уставы на валокі” | 3) БГАВ |
| Г) прыняцце III Статута ВКЛ | 4) АВБГ |

**20. Устанавіце паслядоўнасці падзей, якія адбываліся ў 19 – пачатку 20ст**:

| | |
|---|---|
| А) увядзенне земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях | 1) БВГА |
| Б) паўстанне пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага | 2) БГВА |
| В) пачатак першай расійскай рэвалюцыі | 3) ГБВА |
| Г) далучэнне ўніяцкай царквы да праваслаўнай | 4) ГБАВ |

**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па гісторыі Беларусі**

Выберыце правільныя адказы. Звярніце ўвагу, што ў пытаннях можа быць некалькі правільных адказаў.

**1. Паверхню глінянага посуду старажытныя людзі ўпрыгожвалі:**
а) мініяцюрамі; б) фрэскамі; в) арнаментам; г) вітражамі.

**2. Самастойныя тэрытарыяльныя адзінкі, на якія распадалася дзяржава ў перыяд раздробленасці:**
а) прыёмныя землі; б) епархіі; в) удзельныя княствы; г) губерні.

**3. Вызначце орган кіравання ў Полацкім княстве, які меў права пазбавіць князя ўлады:**
а) соймік (сеймік); б) веча; в) рада; г) магістрат.

**4. Вызначце імя асветніка і рэлігійнага дзеяча 12ст., якога пры жыцці называлі Златавустам:**
а) Кірыла Тураўскі; б) Лазар Богша; в) Усяслаў Брачыславіч; г) Аўраам Смаленскі.

**5. Праваслаўная царква ў ВКЛ у другой палове 16-першай палове 17ст.:**
а) імкнулася да уніі з пратэстанцкай царквой;
б) атрымала падтрымку з боку дзяржаўнай улады;
в) уступіла ў паласу крызісу;
г) стала самым буйным землеўладальнікам у ВКЛ.

**6. Канфедэрацыяй у Рэчы Паспалітай называлася (-ўся):**
а) манаская ці духоўна-рыцарская арганізацыя;
б) вышэйшы шляхецкі саслоўна-прадстаўнічы орган;
в) адзін з кірункаў рэфармацыйнага руху;
г) часовы ваенна-палітычны саюз шляхты.

**7. У Беларусі ў другой палове 16-18ст. фальваркам называлася (-ўся):**
а) сялянская павіннасць; б) заканадаўчы акт;
в) феадальная гаспадарка; г) форма арганізацыі гандлю.

**9. Вызначце прычыну шляхецкага паўстання 1830-1831гг.:**
а) забарона ўрадам дзейнасці каталіцкай царквы;
б) незадаволенасць умовамі адмены прыгоннага права;
в) стварэнне вялікай колькасці ваенных пасяленняў;
г) незадаволенасць шляхты падзеламі Рэчы Паспалітай.

**10. На тэрыторыі Беларусі ў першай палове 19ст. у развіцці гандлю галоўную ролю адыгралі:**
а) аўкцыёны; б) крамы; в) кірмашы; г) біржы.

**11. Вызначце назву беларускай легальнай грамадска-палітычнай, літаратурна-мастацкай газеты, якая выходзіла ў 1906-1915гг.:**
а) "Светач"; б) "Мужыцкая праўда"; в) "Наша ніва"; г) "Гоман".

**12. Вызначце фактар, які аказаў вялікі ўплыў на рост і развіццё беларускіх гарадоў у другой палове 19ст.:**
а) высокая ўдзельная вага беларускага капіталу ў прамысловасці;
б) стварэнне акцыянерных таварыстаў;
в) будаўніцтва чыгунак на тэрыторыі Беларусі;
г) хуткае развіццё цяжкай прамысловасці.

**13. У нацыянальным руху на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у 1860-я гг. палітычная групоўка "белых" выступала за:**
а) захаванне адзінай і непадзельнай Расіі;
б) прадастаўленне народам права на самавызначэнне;
в) арганізацыю ўсенароднага паўстання;
г) выкарыстанне мірных сродкаў барацьбы.

**14. Вызначце падзею першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якая вымусіла царскі ўрад абвясціць Маніфест:**
а) "Крывавая нядзеля";
б) Кастрычніцкая ўсерасійская палітычная стачка;
в) Курлоўскі расстрэл у Мінску;
г) спробы паўстанняў у Баранавічах і Гомелі.

**15. Адзначце галоўны вынік Лютаўскай рэвалюцыі 1917г. для дзяржаўнага развіцця Расіі:**
а) прадастаўленне народам аўтаноміі ў складзе Расіі;
б) устанаўленне канстытуцыйнай манархіі;
в) звяржэнне манархіі;
г) выхад Расіі з Першай сусветнай вайны.

**16. Прачытайце вытрымку з дакумента і запішыце назву сістэмы поглядаў, аб якой гаворыцца ў тэксце.**
"...існуе вялікая патрэба ведаць Заходнюю Расію па-руску і ўводзіць у гэта веданне і разуменне мільёны...простых маларусаў, беларусаў і літвінаў...Называючы ўсю гэту краіну Заходняй Расіяй, мы відавочна, глядзім на яе з сярэдзіннай часткі рускай дзяржавы...а калі адтуль глядзець на захад, то можна без вялікай памылкі назваць Заходняй расіяй не толькі Беларусь, але і Украіну, і Літву".

**17. Пазнайце гістарычную асобу і запішыце прозвішча.**
Вядомы палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады канцлера, гетмана вялікага літоўскага. Адзін са складальнікаў і рэдактар Статута 1588г.

**18. Устанавіце адпаведнасць паміж элементамі двух мностваў (гісторыя Рэчы Паспалітай):**

| | |
|---|---|
| А) бітва пад Лоевам; | 1) Лівонская вайна 1558-1583г.г. |
| Б) паходы на Маскву | 2) вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1632-1634г.г. |
| В) захоп Полацка войскамі Івана Грознага | 3) казацка-сялянская вайна 1648-1651г.г. |
| Г) барацьба за Смаленск | 4) інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расію 1604-1618г.г. |

**19. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў 16 - 18ст. у ВКЛ:**

| | |
|---|---|
| А) наданне магдэбургскага права гораду Мінску | 1) АВБГ |
| Б) заключэнне Крэўскай уніі | 2) БГВА |
| В) прынядце Судзебніка Казіміра | 3) БАВГ |
| Г) бітва пад Грунвальдам | 4) ВГАБ |

**20. Устанавіце паслядоўнасці падзей, якія адбываліся ў 19 – пачатку 20ст.:**

| | |
|---|---|
| А) увядзенне земстваў на тэрыторыі Беларусі | 1) ГАБВ |
| Б) заснаванне Ф.Савічам "Дэмакратычнага таварыства" | 2) БГАВ |
| В) Лютаўская рэвалюцыя | 3) БВАГ |
| Г) стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) | 4) АГБВ |